# Багацце, створанае народам

Апошнім часам разнастайныя помнікі мастацтва пачалі займаць усё большае месца ў духоўным жыцці грамадства. Яшчэ некалькі гадоў назад можна было бачыць абыякавае стаўленне да старажытнасцей, пашкоджанне ці нават разбурэнне помнікаў дойлідства, курганных могільнікаў і гарадзішчаў, культурных археалагічных пластоў у гістарычных цэнтрах нашых гарадоў і мястэчак. Цяпер становішча паступова мяняецца. Увага, што надаецца савецкай дзяржавай патрыятычнаму выхаванню чалавека на багатых традыцыях гісторыі і культуры мінулага, стасуецца з тымі дыялектычнымі адносінамі да спадчыны, пра якія клапаціўся У. І. Ленін. Сёння больш чым калі зразумела, што сапраўднае патрыятычнае выхаванне моладзі без наглядных прыкладаў немагчыма, як немагчыма без іх і ўсебаковае развіццё сучаснай культуры.

Каб вывучэнне мастацкай спадчыны было ўсеагульным, недастаткова артыкулаў і навуковых манаграфій па розных яе аспектах. Патрэбны яшчэ энцыклапедычныя, даведачныя і абагульняючыя выданні.

Адным з першых і з'яўляецца шасцітомная «Гісторыя беларускага мастацтва», выданне якой нарэшце распачата ў рэспубліцы. Першы том складаецца з трох вялікіх глаў, якія ў сваю чаргу падзяляюцца на раздзелы, адпаведныя асобным храналагічным перыядам.

Уводзіны. У сціслых, дакладных вызначэннях падаюцца вытокі беларускага мастацтва, яго ўзаемасувязі з мастацтвам іншых народаў, называюцца найбольш вядомыя даследчыкі. Крытычна ацэньваюцца дарэвалюцыйныя публікацыі, што залічалі творы беларускага жывапісу, графікі, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, архітэктуры ў актыў суседзяў — то рускіх, то палякаў, а часам і літоўцаў. Станаўленне беларускага мастацтвазнаўства пачалося толькі пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Сярод вучоных, якія распачалі перыядызацыю беларускага мастацтва, знакамітае імя М. М. Шчакаціхіна; яго працы падрабязна разглядаюцца ў томе. Поруч з тым варта было згадаць і І. М. Хозерава, клопатам якога ў навуку ўведзена полацкая архітэктурная школа XII ст. Ён быў першым савецкім археолагам архітэктуры, прычым яго даследаванні і цяпер маюць значную каштоўнасць.

Першая глава прысвячаецца мастацтву першабытнаабшчыннага ладу. Матэрыял тут размяшчаецца ў храналагічным парадку і не падзяляецца на галіны, як у наступных главах.

Вельмі цікавыя жаночыя статуэткі з Елісеевіцкай стаянкі; смаргонская знаходка — арнаментаваная прылада з рога аленя (шкада толькі, што няма яе выявы); неалітычныя гаршкі, аздобленыя геаметрычным арнаментам, схематычнымі малюнкамі качкі і чалавека; статуэт-




**Гісторыя беларускага мастацтва. У 6 т. Мн.: Навука і тэхніка, 1987. Т. І: Ад старажытных часоў да другой паловы XVI ст. 303 с.**

# Спрадвечнае — сучасніку

Першы том «Гісторыі...» ахоплівае велізарны адрэзак часу. Кніга прыгожа аформлена, шчодра праілюстравана чорна-белымі і каляровымі рэпрадукцыямі, а таксама малюнкамі і планамі. Яна ўключае тры главы. Ва ўводзінах расказваецца пра задачы і структуру ўсяго выдання.

Мастацтва першабытнаабшчыннага ладу складае змест першай главы, цалкам пабудаванай на археалагічным матэрыяле, мастацтвазнаўчыя крытэрыі ацэнкі якога своеасаблівыя. Гэта перад усім — шырокая сістэматызацыя помнікаў, асобныя сярод якіх здзіўляюць сваёй вытанчанасцю. Аўтары прызнаюць, што абмежаваная колькасць помнікаў VI—VIII стст., выяўленых на тэрыторыі Беларусі, не дае падстаў для маштабных высноў пра шляхі, формы і характар дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва сівой даўніны. Тым не менш асноўныя тэндэнцыі прасочаны — з мерай асцярожнасці (М. М. Яніцкая). Асаблівая ўвага аддаецца тыпалогіі вырабаў з металу.

Мастацтва заходніх зямель Старажытнай Русі асветлена ў гісторыі дастаткова поўна і шматбакова, з улікам мясцовай палітычнай спецыфікі. Таму яскравей робяцца і лакальныя рысы горадабудаўніцтва, тыпалагічныя варыянты жыцця і гаспадарчых пабудоў (П. Ф. Лысенка). Выразна акрэслена развіццё мураванага дойлідства XI—XIII стст. (П. А. Рапапорт). Сціслы выклад не зашкодзіў раскрыць архітэктурныя і будаўнічыя адметнасці кожнага з помнікаў, пачынаючы з Сафійскага сабора (сярэдзіна XI ст.) у Полацку. За тымі ці іншымі пабудовамі, многія з іх дайшлі як руіны, упершыню паўстае вынік дзейнасці арцеляў і больш рэльефна вымалёўваецца постаць полацкага дойліда Іаана, які пабудаваў у сярэдзіне XII ст. Спаскі сабор Ефрасіннеўскага манастыра. Характарыстыка архітэктурных школ — полацкай і гродзенскай — таксама з'яўляецца заслугай аўтара раздзела. Як вядома, з ліку вежаў-данжонаў XIII ст. на тэрыторыі Беларусі захавалася толькі камянецкая, блізкая паводле тыпу да пашыраных у Заходняй Еўропе.

Усе важнейшыя помнікі манументальнага жывапісу вядомы ў фрагментах. Даводзіцца таму здабываць інфармацыю з вялікімі намаганнямі (А. А. Сяліцкі, В. В. Церашчатава). Фрагменты фрэсак Сафійскага сабора і храмаў Бельчыцкага Барысаглебскага манастыра ў Полацку засталіся, па сутнасці, няўзноўленымі. Найбольш аналізуюцца несправядліва забытыя раней роспісы Спаскага сабора Ефрасіннеўскага манастыра, якія стылёва збліжаюцца з візантыйскімі фрэскамі трэцяй чвэрці XII ст. у Македоніі. У ацэнцы гэтага цыкла няцяжка памыліцца. Мудрэй пакуль не ісці далей канкрэтных назіранняў, што і ўсведамляюць аўтары. У прыватнасці, па-ранейшаму праблематычная іканаграфічная праграма [1]. Каб прасачыць стан манументальнага жывапісу заходнерускіх зямель у далейшым — абавязкова выкарыстаць смаленскі сценапіс, даследаваны М. М. Вароніным [2].

Твораў іканапісу XI—XIII стст. на тэрыторыі Беларусі не захавалося ўвогуле. І разглядаецца найперш мініяцюра (В. Ф. Шматаў), хоць гаворка хутчэй павінна была б ісці пра кніжнае мастацтва ў цэлым. Не зусім ясна, чаму бяруцца мініяцюры Трырскага псалтыра (кодэксы Гертруды), выкананыя ў Кіеве ў 1073 г., а неўзабаве — у Рэгенсбурзе [3]. Думаецца, нельга сёння называць заходнерускімі паводле паходжання Рэймскае евангелле і Супрасльскі рукапіс, пра якія ўжо зроблены праблемныя высновы [4]. Не загадкавае больш і месца выканання Служэбніка Варлаама: ён выйшаў з епіскапскага скрыпторыя ў Пярэмышлі, дзе



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ка лася; драўляная скульптурка чалавека і мужчынская галоўка з косці (абедзве з Асаўца Бешанковіцкага раёна). Творы нашых неалітычных продкаў маюць еўрапеоідныя рысы. Пра першыя гандлёвыя сувязі плямёнаў, што некалі насялялі тэрыторыю сучаснай Беларусі, расказваюць знаходкі бурштынавых караляў, вырабы са шкла і медзі.

У апошнім раздзеле главы гаворка ідзе пра матэрыяльную культуру балцкіх і славянскіх плямёнаў. Славяне з'явіліся на поўдні Беларусі ў V—VI стст. Тут шмат апісальніцтва, уласцівага больш для спецыяльных манаграфій, чым для абагульняльнай працы, і зусім мала ілюстрацый. Няма чамусьці выяў керамічных вырабаў ранняга жалезнага веку, асабліва глянцаванага посуду зарубінецкай культуры, арнаментаваных грузікаў і праслачкаў мілаградскіх плямёнаў або носьбітаў культуры штрыхаванай керамікі. Адсутнічаюць і фотаздымкі каляровых шкляных пацерак.

Значна большая паводле зместу другая глава, дзе аналізуецца мастацтва IX—XIII стст. Грунтоўна выкладзены горадабудаўніцтва і архітэктура, даецца дакладная характарыстыка састаўных частак старажытнага ўсходнеславянскага горада — дзядзінца і пасада на канкрэтных прыкладах Полацка, Турава, Пінска і Мінска. Культурны пласт у гістарычных цэнтрах нашых гарадоў даволі добра зберагае рэшткі драўлянай забудовы. Дзякуючы шматгадовым даследаванням археолагаў можна дакладна рэканструяваць жылую і гаспадарчую забудову Брэста, Мінска, Мсціслава, Віцебска, Гродна і іншых гарадоў XI—XVII стст. На жаль, нічога не сказана пра драўляныя дамы навагрудскіх заможных жыхароў XII—XIII стст., што мелі ўнутры фрэскавы роспіс, а гэта ж выключная з'ява ў горадабудаўніцтве Кіеўскай Русі.

Манументальнае дойлідства Полацка, Гродна, Віцебска, Турава і інш., полацкая і гродзенская архітэктурныя школы, іх адметныя рысы, асноўныя прыёмы будаўнічай тэхнікі асвятляюцца, як правіла, на аснове апошніх дасягненняў у галіне архітэктурнай археалогіі і гісторыі архітэктуры. Таму спынімся толькі на некаторых недакладнасцях гэтага раздзела. Заходнія апсіды прыбудаваны да Полацкай Сафіі не ў XVIII ст., а раней, магчыма, у XVI—XVII стст., і зроблены яны з плінфы, на вапнавай рошчыне. Надта спрэчнае выказванне, што Сафійскі сабор меў дзве галерэі (с. 58). На с. 62 змешчана няўдалая рэканструкцыя Спаса-Ефрасіннеўскай царквы ў Полацку, прычым напісана, што яна выканана П. А. Рапапортам. На самой справе той прыводзіць у сваіх публікацыях зусім іншую рэканструкцыю [1]. Недакладна апісана муроўка Віцебскай Благавешчанскай царквы XII ст. (с. 65). Яна ніколі не мела «чырвона-белай у палосы паверхні сцен», бо з самага пачатку сцены царквы былі пакрыты слоем тынкоўкі, разбітай вапнавымі палоскамі белага колеру (таўшчыня каля 1,5 см) на русты адпаведна формам і памерам каменных блокаў, якія апынуліся пад тынкоўкай. Упершыню гэта цікавая рыса муроўкі названага храма зафіксавана Г. В. Штыхавым у 1974 г. [2]. Няправільна пададзены план Каложскай царквы ў Гродне (мал. 24). Замест трох апсідаў паказана адна.

Нічога не паведамляецца пра нядаўна адкрыты помнік гродзенскага дойлідства XII ст.— Прачысценскую царкву, якая знаходзілася на пасадзе [3].

Значным укладам у развіццё мастацтвазнаўчай навукі з'яўляецца раздзел пра фрэскавы жывапіс Полацка і Віцебска і кніжныя мініяцюры. Шкада толькі, што абыдзены навагрудскія фрэскі, выяўленыя Ф. Д. Гурэвіч [4], а маёлікавыя пліткі з вонкавага дэкору Каложскай царквы называюцца кафляй (с. 85). Выклікае здзіўленне сцвярджэнне, быццам Ефрасіння Полацкая пісала кнігі «ў галубятні аднаго з мураваных храмаў, які знаходзіўся побач з Сафійскім саборам».

Добра ілюстраваны і цікава напісаны раздзел пра скульптуру і дробную пластыку. Трэба адзначыць, што аўтары яго (у адрозненне ад некаторых іншых) спасылаюцца на самыя найноўшыя публікацыі і ўдала ўводзяць у навуковы ўжытак матэрыялы з розных выданняў.

---

быў створаны для архіепіскапа Антонія, які завёз яго ў Ноўгарадскі Хутынскі манастыр. Разважаючы пра мініяцюры Аршанскага евангелля (XIII ст.), важна было ўлічыць звесткі тыпалогіі ініцыялаў, асабліва тэраталагічных, без структурных прыкмет якіх уяўленне пра мастацкае аблічча кнігі няпоўнае. І, зразумела, варта было згадаць Полацкае евангелле канца XII — пачатку XIII стст., якое захоўваецца ў Дзяржаўнай Публічнай бібліятэцы імя М. Я. Салтыкова-Шчадрына ў Ленінградзе.

Хоць наступны раздзел прысвечаны скульптуры і дробнай пластыцы (В. Г. Пуцко, Г. В. Штыхаў), у ім разглядаюцца пераважна вырабы малых форм: касцяныя шахматы і вухачысткі. Гэты матэрыял друкаваўся папярэдне з аргументацыяй. Але абмеркаванне праблем, звязаных з ім, працягваецца ў спецыяльнай літаратуры і цяпер [5]. Больш падрабязна, а не між іншым магло быць сказана пра металапластыку, да таго ж — не абмінаючы мастацкай значнасці бронзавага ліцця.

У раздзеле дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (Я. М. Сахута, М. М. Яніцкая, А. І. Сямёнаў, Д. С. Трызна) падаюцца арнаментаваныя вырабы з косці, дрэва, бурштыну, шкла, бронзы, каштоўных металаў. Вылучаны прадметы мастацкага імпарту (усходняе шкло). Назаўсёды прапісаны ў памяці Полацка славуты крыж Ефрасінні Полацкай работы Лазара Богшы 1161 г. «Радавы» матэрыял часта вымагае ад даследчыкаў большай працаёмкасці на яго вывучэнне, і таму важкія вывады атрыманы пра гліняны посуд, керамічныя пліткі (маёліку). Асабліва ж складанае вывучэнне керамічных знаходак, тканін. Прыкрае непаразуменне — датаванне XI стагоддзем шытай золатам плашчаніцы. Плашчаніцы з'явіліся ў Візантыі толькі ў XIII ст. А тут, відаць, маецца на ўвазе плашчаніца з Мікалаеўскага сабора ў Вільнюсе — твор сталага шытва XV ст.

Глава пра мастацтва перыяду фарміравання беларускай народнасці (XIV—XVI стст.) самая разгорнутая і найбольш укамплектаваная матэрыялам. Горадабудаўніцтва і архітэктура асвятляюцца падрабязна з вылучэннем абарончага (М. А. Ткачоў), драўлянага (Ю. А. Якімовіч) і мураванага культавага (Т. В. Габрусь) дойлідства. У горадабудаўніцтве прасочана роля беларускай архітэктуры як сувязнога звяна паміж традыцыямі заходнерускіх зямель і праявамі стыляў, што ішлі з Захаду праз Польшчу і Літву (Т. І. Чарняўская). Лідскі, крэўскі, мірскі, геранёнскі замкі — пацвярджэнне таму. У абарончай сістэме гарадоў і крэпасцей выразна адбілася ўзмацненне ваеннай небяспекі, што абумовіла выкарыстанне новых па тым часе тыпаў фартыфікацыйных збудаванняў. Пра драўлянае дойлідства, найбольш пашыранае ў краі, даводзіцца меркаваць пераважна паводле архіўных дакументаў. Што да тагачасных мураваных храмаў, то яны рэзка адрозніваюцца ад старажытнарускіх перш за ўсё распаўсюджаннем новага тыпу скляпення, пазначанага ўплывам готыкі. На рубяжы XV—XVI стст. будуюцца храмы-крэпасці з чатырма кутавымі вежамі — у Сынковічах, Мураванцы. У цэлым архітэктура на Беларусі стала рознахарактарнай, што тлумачыцца часткова ўмовамі заказаў ад розных канфесій. У кнізе акрэслены яе асноўныя напрамкі, не абрываюцца нііцінкі, якія дзе-нідзе цягнуцца з Заходняй Еўропы.

Манументальны жывапіс XIV—XVI стст. на ўласна беларускай тэрыторыі не збярогся (пра яго вядома з архіўных і літаратурных крыніц). Сценапіс «візантыйскага стылю» ў Польшчы ўзнік падчас існавання Вялікага княства Літоўскага, і гаворка пра помнікі яго можа весціся ў гісторыі мастацтва Беларусі (з тым самым правам, як гэта робіцца ў гісторыі мастацтва Украіны). Аднак нельга ігнараваць моўныя асаблівасці кцітарскага надпісу ў капліцы св. Троіцы ў Любляне (1418), з якіх вынікае сувязь майстра Андрэя з Перамышлем. Фрэскі Благавешчанскай царквы Супрасльскага манастыра (1557) выкананы Няктарыем Сярбыніным. Ці з'яўляюцца гэтыя роспісы прамым прадаўжэннем традыцый Кіеўскай Русі? Цяжка даць адназначны адказ, пакуль не высветлім, што трэба разумець пад выпрамяненнем традыцый аддаленай эпохі.

Беларускі іканапіс XV—XVI стст., раздзел якога напісаны Э. І. Вецер, абавязаны адкрыццям сучасных даследчыкаў. Калі зусім нядаўна меркаванні пра яго былі няпэўнымі, то цяпер нават помнікі ў значнай меры каталагізаваны [6]. Беларускі іканапіс развіваўся ў цеснай узаемасувязі з украінскім (асабліва валынскім), а часткова і паўднёваславянскім. Узор балканскага мастацкага імпарту — абраз з Маларыты (XIV ст.). Візантыйскія традыцыі ў творчасці мясцовых майстроў адметна азначыліся ўжо на рубяжы XV—XVI стст., пра што сведчыць абраз Маткі боскай Іерусалімскай з Пінска. Аднак моцнай была і народная аснова мастацтва іканапісцаў, якія абслугоўвалі найперш не паланізаваную шляхту, а больш шырокія колы грамадства. Вельмі падобныя абставіны склаліся тады ж ва ўкраінскіх суседзяў. На Беларусі створаны выдатныя ўзоры партрэтнага жывапісу, што ўвасобіў мясцовых магнатаў, даводзяць Л. М. Дробаў і Г. Г. Сакалоў-Кубай. Да нас дайшоў шэраг імёнаў майстроў, якія працавалі ў розных мастацкіх цэнтрах [7]. І ўсё ж пры наяўных звестках можна было яскравей адлюстраваць развіццё іканапісу, глыбей раскрыць характар яго дэмакратычных асноў. Рана таксама ста-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Агляд беларускага мастацтва XIV—XVI стст. (апошняя глава кнігі) пачынаецца з паказу архітэктурнай і горадабудаўнічай спадчыны. Гаворыцца пра замкавае, а потым — пра культавае і грамадзянскае будаўніцтва. Дакладна прасочана эвалюцыя абарончых збудаванняў на Беларусі — ад мураванай вежы-«стаўпа» сярод драўляных гароднях да шматвежавага замка-кастэля і бастыёнаых замкаў XV—XVII стст. Дастаткова поўна прасочаны таксама пераход ад гатычных культавых пабудоў XV — пачатку XVI стст. да помнікаў рэнесансу і ранняга барока. Аднак шкада, што ні слова не сказана пра культавыя і грамадзянскія помнікі менавіта XIV ст. Маюцца на ўвазе Верхняя царква ў Гродне, царква і двухпавярховы мураваны будынак феадала на навагрудскім замчышчы[5]. Засталіся па-за ўвагай даследчыкаў некаторыя вядомыя помнікі XV—XVI стст., напрыклад фарны касцёл Вітаўта ў Гродне і царква ў Кодне. Нельга пагадзіцца з тым, «што ў XIV—XVI стст. пашырылася раўнаслойная цагляная муроўка з перавязкай тычковых і лажковых радоў» (с. 130). Такі тып муроўкі з'яўляецца толькі ў другой палове XVI ст., а ў XIII—XVI стст. існавалі «балтыйская», або «вендская», і гатычная муроўкі[6]. Можна дадаць, што для аздаблення фасадаў гатычных будынкаў шырока скарыстоўвалася «клінкерная», перапаленая цэгла.

Доўгі час «белаю плямай» у гісторыі беларускага мастацтва былі фрэскавы жывапіс, а таксама абраз XIV—XVI стст. Цяпер намаганнямі нашых даследчыкаў гэтая праблема асветлена ў значнай ступені. Раскрываюцца таксама цесныя сувязі ў гэтай сферы з тагачасным польскім, рускім і ўкраінскім мастацтвам. Слушная выснова даследчыкаў беларускага жывапісу XVI — пачатку XVII стст. пра тое, што «іканапіс пад уплывам рэнесансных настрояў узбагачаецца элементамі дэкарацыі еўрапейскага мастацтва і выпрацоўвае некаторыя новыя якасці, а алтарны жывапіс трапляе пад моцны ўплыў мясцовай традыцыйнай іканапіснай сістэмы і адыходзіць ад класічных еўрапейскіх форм» (с. 203).

Паглыблена разгледжаны ў кнізе беларуская скульптура, мініяцюра і гравюра. І ў той жа час раздзел дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва невялікі. У ім няма такіх відаў, як ткацтва, апрацоўка косці, дрэва, скуры. Не трапіў у поле зроку даследчыкаў і бытавы посуд. А менавіта ў канцы XV — пачатку XVI стст. зноў з'яўляецца палíва і асартымент посуду істотна павялічваецца. У XVI ст. канчаткова склаўся асартымент сталовага начыння: рынкі, талеркі, кубкі, куфлі, чаркі, паліваныя гаршкі і г. д.[7] Большасць гэтых вырабаў мела разнастайны арнамент. Сціпла паказана і кафля, прычым некаторыя тыпы яе арнаменту, напрыклад партрэтны (сярэдзіна — другая палова XVI ст.), не згаданы. На малюнку 194 замест карнізнай кафлі знаходзіцца сцянная, да таго ж XVII ст. Відаць, да XVII ст. можна аднесці і кафлю на малюнках 196—197.

На заканчэнне хочацца сказаць, што нягледзячы на дробныя памылкі і пралікі, якіх цяжка пазбегнуць у такім выданні, студэнты, настаўнікі, выкладчыкі, мастакі, журналісты, пісьменнікі — усе, хто цікавіцца вытокамі беларускага мастацтва, атрымалі, няйначай, падарунак.

**Алег ТРУСАЎ.**

[1] Раппопорт П. А. Русская архитектура X—XIII вв. // Свод археологических источников. Вып. Е1—47. Л., 1982. С. 97. Рис. 25.

[2] Архіў Інстытута гісторыі АН БССР, спр. 477. Справаздача Г. В. Штыхава за 1974 г. Мал. 41, 42.

[3] Чернявский И. М. Архитектурно-археологические исследования в Гродно и Могилеве // Археологические открытия 1980 г. М., 1981. С. 346—347; Чарняўскі І. М., Жаровіна Г. П. Нечаканае адкрыццё // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1982. № 4.

[4] Гурэвіч Ф. Д. Знойдзена ў Навагрудку // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1983. № 4.

[5] Малевская М. В. Архитектурный комплекс новогрудского детинца XIII—XIV вв. // Древнерусское государство и славяне. Мн., 1983.

[6] Трусаў А. Графіка даўніх муроў // Мастацтва Беларусі. 1987. № 3.

[7] Здановіч Н. Гармонія пластыкі і дэкору // Мастацтва Беларусі. 1986. № 1.

віць кропку ў даследаванні партрэта, які шчыльна ўпісваецца ў гісторыю еўрапейскага класічнага жывапісу і ў асобных выпадках прадстаўлены работамі замежных мастакоў.

Неаднародная і скульптура (аўтар раздзела — А. К. Лявонава), сярод якой — творы меднага ліцця са Старажытнай Русі, разьбяны драўляны абразок, выкананы пінскім майстрам Ананіем, і драўляная скульптура заходняй традыцыі. Тут таксама выявіліся канфесіянальная прыналежнасць і сацыяльнае становішча заказчыкаў, якія істотна вызначалі адбор мастакоў. Надта рэдка выступалі яны ў такім гарманічным спалучэнні, як у разьбе царскіх варот з Варанілавічаў, што зазнала ўздзеянне гравюры «Евангелля», надрукаванага Пятром Мсціслаўцам.

Кніжнае мастацтва XIV—XVI стст. (В. Ф. Шматаў) пададзена не толькі рукапісамі, але і друкаванымі выданнямі. Вядомы скрыпторыі (напрыклад, у Жыровіцкім манастыры), перапісаныя кнігі (напрыклад, у віцебскім Маркавым манастыры) і імёны перапісчыкаў. Але прадукцыя іх вывучана збольшага, хоць моўныя рысы пісьма павінны дапамагчы размежаваць беларускія ілюмінаваныя кнігі з украінскімі і балканскімі (сістэма афармлення апошніх цяпер дастаткова выяўлена). І тады стане больш відавочна, якімі элементамі заходняга характару ўбранства абавязана «лацінскаму» суседству, а якімі — паўднёваславянскаму пасрэдніцтву. Больш пільнай увагі патрабуе і развітая тэраталогія Мсціслаўскага евангелля (XIV ст.). Гісторыка-мастацкае значэнне Шарашоўскага евангелля (XVI ст.) ставіць на парадак дня яго манаграфічнае даследаванне. Разважаючы пра мініяцюры Лаўрышаўскага евангелля (пачатак XIV ст.), варта было ўлічыць асноўную літаратуру пра яго[8]. Што ж датычыць мініяцюр Слуцкага евангелля? ... жэбніка, не агавораны даўнія вывады У. М. Перэтца, перад тым як уключаць помнік у гісторыю беларускага мастацтва[9]. Такім чынам, ілюмінаваныя рукапісы — найслабей апрацаваны матэрыял, які, аднак, абяцае пры грунтоўным аналізе важкія вынікі.

У раздзеле, які тычыцца гравюры, падсумаваны прынятыя ўяўленні пра мастацкае аблічча выданняў Ф. Скарыны, В. Цяпінскага, П. Мсціслаўца, Мамонічаў.

Даследчыкі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва адчувалі недахоп рэчавага матэрыялу, асабліва ў ювелірнай справе. Але чамусьці нічога не сказалі пра палыцір 1594 г. з рызніцы Святадухаўскага манастыра ў Вільнюсе і крыж канца XVI ст., які прыпісваецца Параскеве Полацкай[10]. Характэрна, што ў тарэўтыцы, як і ў архітэктуры, на Беларусі найбольш акрэсліліся праявы готыкі. Архітэктурна-дэкаратыўная кераміка паказваецца на падставе археалагічных знаходак (М. А. Ткачоў). Лаканічна абмалявана шкларобства (М. М. Яніцкая). Вывад, што дэкаратыўна-прыкладное мастацтва XIV—XVI стст. зрабіла значны крок наперад, заканамерны, хоць не надта шчодра падмацаваны рэчавымі доказамі. Іх трэба чакаць.

У цэлым кніга дае пераканальную карціну развіцця мастацтва ў старажытнай Беларусі. Зразумела, у калектыўнай працы непазбежна адрозненне аўтарскіх «почыркаў». Вось чаму іншы раз канцэптуальнасць змяняецца апісальніцтвам. Аднак першы вопыт ёсць першы вопыт, і такія-сякія хібы ў ім заўсёды знойдуцца. Падрыхтоўка тома, як можна меркаваць па адсутнасці спасылак на найноўшую літаратуру, у тым ліку і на кнігі аўтараў раздзелаў, зацягнулася ў часе. Увогуле паказальнік літаратуры вельмі няпоўны, з прыкрымі пропускамі спецыяльных работ.

Нарэшце, згадаем, што без работ многіх пакаленняў вучоных стварэнне гісторыі беларускага мастацтва было б немагчымае. Гэта найлепш відаць там, дзе матэрыял застаўся некранутым, бо ніякі агульны погляд не здольны прыкмеціць у помніку ўсё. Ён жа выяўляе ідэі не толькі майстра, але часта — і цэлай эпохі.

**Марына БАЧКАРОВА (г. Калуга).**

[1] Гл.: Сяліцкі А. А. Новае аб фрэсках Спаса-Праабражэнскага сабора ў Полацку // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1983. № 2.

[2] Воронин Н. Н. Смоленская живопись 12—13 вв. М., 1977.

[3] Пуцко В. Тема коронования в миниатюре Трирской псалтири // Българско средневековие. София, 1980.

[4] Жуковська Л. П. Гіпотези й факти про давньоруську писемність до XII ст. // Литературна спадщина Київської Русі і українська література XVI—XVIII ст. Київ, 1981; Иванова-Мавродинова В., Мавродинова Л. За украсата на Супрасълския сборник // Литературознание и фолклористика. София, 1983.

[5] Гл.: Pucko W. Połocki relief steatytowy i problem zachodnich wpływów w sztuce ruskiej XII wieku // Biuletyn historii sztuki. 1983. R. XLV, NR 3/4.

[6] Музей старажытнабеларускай культуры / Каталог экспазіцыі. Мн., 1983; Высоцкая Н. Ф. Темперная живопись Белоруссии конца XV—XVIII веков в собрании Государственного художественного музея БССР / Каталог. Мн., 1986.

[7] Второе рождение портретов из Несвижа и Гродно / Каталог. Мн., 1981.

[8] Mole W. Les miniatures de l'evangeliare de Lavrachev // L'art byzantin chez les Slaves. Paris, 1932. T. 2. P. 421—437; Friedelowna T. Ewangeliars Lawryszewski. Wrocław, 1974.

[9] Перетц В. Н. Псевдо-новгородское Евангелие 1575 г. Новгородского церковного древнехранилища // Историко-литературный сборник, посвященный В. И. Срезневскому. Л., 1924. С. 262—268.

[10] Пуцко В. Г. Мнимый крест Параскевы Полоцкой // Беларускія старажытнасці. Мн., 1972.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ